Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

НАША ПРАЎДА

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр.	Нипрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок петыту ў 1 шпальту.

№ 25 Вільня, Серада 29-га чэрвеня 1927 г. Год I

Замах на правы „Крэсаў".

Запраўды-ж, інакш, як замахам на правы „Крэсаў", нельга назваць факту паразуменьня галоўных польскіх партыяў у Сойме ў справе зьменаў у выбарным законе ў польскі парлямант.

Усе выкрыкі польскае прэсы аб патрэбе зьменшыць—дзеля „эканоміі"—лічбу пасольскіх мандатаў у Сойме аказаліся простай хлусьнёй: тварцом праектаваных зьменаў, якія мы ніжэй зьмяшчаем, ішло зусім не аб тое, каб зьменшыць выдаткі на соймавае прадстаўніцтва народу, а аб нешта зусім іншае. Паказуюць на гэта ажно дзьве рэчы: лічба паслоў мае быць паменшана адно толькі на 24 (замест 444—420), а самае зьмяншэньне мае быць зроблена... *коштам беларусаў і ўкраінцаў* на так-званых „Усходніх Крэсах". На ўсю Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну (абыймаючы і Усходнюю Галічыну), якія займаюць *бязмала палову* абшару Польскае Рэспублікі і маюць у сваіх межах *траціну* ўсяго насяленьня дзяржавы, — пануючыя ў Сойме польскія партыі ласкава пакідаюць... 60 пасольскіх мандатаў з агульнае лічбы 420, — знача, усяго толькі *сёмую частку*...

Мы ня ведаем, ці праект гэткіх зьменаў у выбарным законе пройдзе ў Сойме ў тым відзе, які ён мае сягоньня, але бясспрэчным зьяўляецца адно: тое, што польская большасьць Сойму знойдзе ў гэтай справе супольны язык і здолее „паразумецца". Так заўсёды ўмелі паразумявацца польская правіца і буржуазная лявіца, а самым яркім прыкладам гэтага можа служыць бясслаўны закон аб асадніцтве, які згодна правялі ўсе польскія партыі.

Такім чынам перад намі ўзьнімаецца паважная небясьпека. Беларускае прадстаўніцтва ў варшаўскім Сойме—непамерна малое й цяпер. Як ведама, на беларускія выбарныя акругі адзін пасольскі мандат у 1922 годзе прыпадаў на 70—80,000 душ насяленьня — пад той час, калі на польскіх землях маглі выбіраць свайго пасла часамі навет 40 — 45,000 душ народу! Паводле праекту польскіх партыяў Сойму сучасная лічба мандатаў з нашага краю мае быць яшчэ паменшана....

Чым выкліканы гэныя праекты? Чаго маняцца дапяць гэтым спосабам аўтары іх?

Адказ дужа просты. Магутны рост *нацыянальнае і клясавае сьвядомасьці беларускіх працоўных масаў*, які выявіўся—з аднаго боку — ў магутным сялянска-работніцкім руху, а з другога—ў выніках выбараў у мястовыя і гмінныя самаўрады, — на сьмерць напалохаў польскую буржуазію — перадусім „нашу", „крэсавую". Польская буржуазія дужа добра разумее, што, калі ў 1922 годзе йшчэ магло польскае „Вызваленьне" падмануць часьціну беларускага сялянства сваімі радыкальнымі лёзунгамі, дык цяпер часы другія: ніякі фальшаваны радыкалізм ня здолее зьбіць нашы працоўныя масы з абранага імі шляху клясавага змаганьня пад сялянска-работніцкім сьцягам. І, шчодра сыплючы грошы сваім наёмным баламутам, творачы партыі і часопісі буржуазна-згодніцкага кірунку,—занепакоеныя „гаспадары палажэньня" хапаюцца за апошні спосаб пазбаўленьня беларускіх масаў голасу--шляхам узаконенага гвалту над забясьпечанымі нам польскай канстытуцыяй і міжнародавымі трактатамі правамі...

Гэты спосаб найлепш паказуе пачуцьцё ўласнае слабасьці польскае буржуазіі, пачуцьцё бескарыснасьці ўтрымліваньня розных псэўда-беларускіх арганізацыяў з здраднікамі нашага народу на чале. Але разам з тым ён-жа паказуе і тое, як нашы сацыяльныя й нацыянальныя ворагі ацэніваюць *сьвядомасьць нашых працоўных масаў* і *здольнасьць іх да арганізованага масавага змаганьня.*

Гэтае сьвядомасьці і гэтае здольнасьці не заб'е ў нас ужо ніякая сіла.

„Клясавая справядлівасьць".

Зьмяшчаючы ў папярэднім нумары нашае газэты стацьцю пад загалоўкам „Крызіс, ці ачышчэньне Сельсаюзу?", —мы толькі выкарысталі апублікаваны самімі сельсаюзьніцкімі дзеячамі дужа цікатны матэрыял аб тэй „тройцы" паслоў і кандыдатаў у паслы (Ярэмічу, Рагулі й Більдзюкевічу), якія выкарыстывалі фірму „Беларускага Сялянскага Саюзу" дзеля сваіх асабістых мэтаў. Аднак, мы засьцерагаемся, што падача запраўды-ж пацяшаючага факту, які сьведчыць аб імкненьні ачысьціць ідэйную работу ад бязыдэйных людзей, зусім не паказуе, быццам мы згаджаемся з ідэалёгіяй новых павадыроў „Сельсаюзу". .Па сваей ідэалёгіі і новыя тварцы „сялянскае" ідэалёгіі вельмі далёка разыходзяцца з нашай сялянска-работніцкай ідэалёгіяй. Прыкладам такога разыходжаньня можа паслужыць праграмная заява ў „Народзе" аб тым, што „Сельсаюз" мае наўвеце „забясьпечаньне клясавае справядлівасьці" ў узаемных адносінах паасобных клясавых групаў.

Што знача гэная заява?

Калі ўнікнем у яе глыбей, дык мусім прызнаць, што яна запраўды-ж вельмі далёкая ад тэй клясавай барацьбы, на груньце якое пабудавана ўся сялянска-работніцкая барацьбяная ідэалёгія. Гутарка „Народу" аб „клясавай справядлівасьці" нам дужа напамінае заяву марш. Пілсудскага пасьля маёвага перавароту, што новая ўлада будзе стаяць на груньце захаваньня істнуючае „сацыяльнае раўнавагі". І тут і там фактычна адкідаецца клясавая барацьба. І тут і там самы факт істнаваньня сацыяльнае няроўнасьці між людзьмі, якая выяўляецца ў падзеле народаў на клясы працоўныя і непрацоўныя, прызнаецца як-быццам зусім нармальным і справядлівым зьявішчам. І тут і там нам гавораць аб імкненьні неяк залагодзіць тыя супярэчнасьці ў інтарэсах паасобных клясаў, якія зьяўляюцца істотнай адзнакай падзелу на клясы. Марш. Пілсудскі гаварыў аб тым, што „несправядлівасьці залішне многа", сельсаюзьніцкія ідэалёгі гавораць таксама аб „клясавай справядлівасьці",—як быццам самы факт, што адны мусяць цяжка працаваць усё сваё жыцьцё, каб пракарміць і сябе, і цэлую грамаду розных непрацоўных элемэнтаў, а другія жывуць у роскашы бяз ніякае працы, не зьяўляецца ўжо найбольш відавочнай і асноўнай несправядлівасьцяй у сучасным грамадзкім жыцьці!...

У сваім выступленьні рэдакцыя „Народу" слушна кажа, што змаганьне паміж партыямі павінна быць не дэмаралізацыйным, не апаганіваньнем паасобных людзей і груп за іх перакананьні, а „ходаньнем перакананьня і аргумэнтацыі". Але-ж аб якой справядлівасьці можа быць гутарка, калі змагаюцца між сабой дзьве клясы, з якіх адна сядзіць і хоча далей сядзець на карку другой?! І калі паміж прадстаўнікамі рознае ідэалёгіі (прыкладам, паміж намі і ідэйнымі сельсаюзьнікамі) можа ісьці змаганьне аргумэнтацыяй і ўзаемным пераконываньнем, дык як можа гэта тасавацца да змаганьня між клясамі — між эксплёататарамі і эксплёатаванымі, між валадарамі і іхнімі рабамі, між буржуазіяй і працоўнымі? Сам факт эксплёатацыі адных людзей другімі — гэта несправядлівасьць. І не зьмяншаць яе толькі імкнуцца працоўныя масы, але зьвясьці да званьня! Але ведама кожнаму, што пануючыя клясы самахоць не зракаюцца сваіх прывілеяў, хаця гэныя прывілеі прадстаўляюць самую грубую несправядлівасьць,—і вось іншага шляху для працоўных, апрача шляху змаганьня, няма.

Праўда, сельсаюзьніцкія ідэалёгі, як відаць, гавораць спэцыяльна аб унутраных адносінах сярод беларусаў, прымаючы пад увагу асаблівую сацыяльную структуру нашага народу: наша „радзімая" буржуазія йшчэ слабая, месца яе займае пераважна буржуазія чужацкая — польская ды расейская. Дзеля адраджэнскага руху яны хацелі бы выкарыстаць і гэны наш беларускі зародыш буржуазіі. Праўда і тое, што пад „сялянскай клясай" рэдакцыя „Народу" разумее выключна тых сялян, якіх лучыць ў-вадно ня факт валаданьня зямлёй на правох уласнасьці, а факт працы сваімі рукамі на ральлі. Але тады працоўнае сялянства мусіць аб'яднацца з усімі працоўнымі наагул, знача й з мястовымі работнікамі, бо іх інтарэсы цалком зыходзяцца, бо і ў адных і ў другіх—тыя самыя сацыяльныя ворагі. І ідэйнае ачышчэньне ў нашым так-званым сялянскім руху мусіць раней ці пазьней зразумець гэта, мусіць замест захоўваньня нейкае незразумелае „клясавае справядлівасьці" пайсьці на шляху клясавага змаганьня працоўных з буржуазіяй — усё роўна, ці свaей, ці чужацкай.

Іншага шляху да лепшае будучыні мы ня маем! І калі новыя сельсаюзьніцкія павадыры ня ўвойдуць на гэты шлях, ім — пры ўсіх іхніх ідэйных імкненьнях — прыдзецца й далей іграць тую паскудную ролю падгалоскаў буржуазіі, якую іграюць ярэмічавы сельсаюзьнікі. А сялянства за імі ня пойдзе, як ня йдзе і за Ярэмічам.

У Сойме.

Урачыстае паседжаньне Сойму—у чэсьць Славацкага.

24 чэрвеня адбылося ўрачыстае паседжаньне Сойму, ахвяраванае памяці паэта Славацкага—у сувязі з перавозам яго касьцей з Парыжу ў Польшчу. Усе газэты адзначаюць адсутнасьць на гэтай урачыстасьці прадстаўнікоў ураду. „Роботнік", сьцьвярдзіўшы „пустату на міністэрскіх лаўках у парляманьце", дзівіцца, што гэтым „палітычным крокам" (дэманстрацыяй проці Сойму) прадстаўнікі ўраду сьцьвярдзілі толькі адсутнасьць „асабістай культуры ды пачуцьця прызваітасьці адносна да генія польскага творства і адносна да... заграніцы"...

Ізноў рад канфліктаў між Соймам і Урадам.

У камісіях насьпявае цэлы рад канфліктаў з Урадам, якія могуць мець зусім неспадзяваныя рэзультаты. Сойм яўна хоча — хаця перад сьмерцяй—крыху паправіць сваю апінію перад выбаршчыкамі. А можа—папросту зрабіць некалькі пекных апазіцыйных ці дэмагагічных рухаў, разьлічаючы на мо' блізкія ўжо выбары.

Эндэкі і пэпэсы ўнясьлі ў Сойм праект павялічэньня пэнсіяў дзяржаўн. урадоўцам, якім урад, у асобе п. Бартэля, абяцаў паправу быту к 1 ліпня, але неяк „не здалеў яшчэ зрабіць адпаведнай статыстыкі", як і што робіцца ў гэтай справе заграніцай! Трэба спадзявацца вострых сутычак на гэтым груньце з урадам.

Узгарэлася ўжо глухая барацьба і ў вайсковай камісіі — у справе незаконнага „разьясьненьня" міністрам вайсковых спраў—у часе выбараў у Варшаўскую мястовую Раду—чыннага, выбарнага права афіцэраў ды пад-афіцэраў (чамусьці такія-ж роўныя ў палітычных правох грамадзяне-жаўнеры не атрымалі ад ваеннага міністэрства „разрашэньня" ды зьняцьця яснай забароны Канстытуцыяй прымаць учасьце ў выбарах). Справа будзе разглядацца на супольным паседжаньні вайсковай і канстытуцыйнай камісіі, дзе мае быць новы бой — між Соймам і ўрадам...

Цяпер ізноў насьпеў новы канфлікт: „апазіцыйныя" пэпэсы ўнясьлі ў Сойм праект часовых „засілкаў" для сем'яў тых запасных, якія паклікаты будуць на вайсковыя вучэньні ды манэўры ўлетку. 24.VI. адбылося паседжаньне вайсковай камісіі, на якой разглядалася гэтая прапазіцыя ППС. Старшыня камісіі заявіў, што ён запрасіў на паседжаньне прадстаўнікоў 4 міністэрстваў. Але зьявіўся толькі адзін — з міністэрства скарбу... Пасьля прамовы дакладчыка Лібэрмана, які даводзіў канечнасьці гэных засілкаў, ды знайшоў і пакрыцьце гэтага выдатку ў суме звыш 3 мільён. злот., слова ўзяў прадст. мін. скарбу, які ад імя ўраду заявіў, што не прадбачыць гэткага выдатку, дый што паўторныя вучэньні запасных — гэта прадоўжаньне іх ваеннай службы, дык наагул аб засілках ня можа быць мовы... Пасьля далейшай дыскусіі камісія амаль не аднагалосна прыняла праект у трох чытаньнях, адкінуўшы навет слушнае дамаганьне—сьпярша паразумецца з бюджэтнай камісіяй, на чым настаіваў прадстаўнік ураду.

Вынікі выбараў у самаўрады!

(З Наваградчыны).

Як войты і розныя „тузы" ў самаўрадах ні палохалі людзей, баючыся ўтраціць пасьля выбараў свае становішчы,—народ не пабаяўся і валам пайшоў на выбары. У выніку ў гмінныя рады прайшла пераважаючая большасьць (—80 да 90 прац.) сьвядомых сялян, каторыя, пэўне-ж, ня схіляць сваей галавы перад дагэтуль моцнымі гміннага „міра" панамі войтамі-абшарнікамі, і апошнім амаль у-ва ўсіх гмінах прыдзецца пакінуць свае становішчы...

Беларускія працоўныя сялянскія масы здалі экзамен надта добра, ня глядзячы на тое, што выбары былі назначаны неўспадзеўкі і на прадвыбарную працу ня было часу.

Агентаў паўлюкевічавых народ зусім збайкатаваў, хаця іх, можна лічыць, на тэрыторыі Наваградчыны зусім і ня было, а гдзе і паказываліся, ды пачыналі палохаць б. „гурткоўцаў", дык там „гурткоўцы" так моцна сталі ў сваю абарону, што блізу зусім апанавалі гмінныя рады.

Умястоўшчына не паказвалася, а Сельсаюзьнікі ніякага послуху ў масаў ня мелі.

Масы ішлі на выбары, трымаючыся мэтаў гаспадарчых і клясавых.

Шмат дапамог у выбарнай працы сьвядомы беларускі інтэлігенцкі элемэнт гарадоў і мястэчак. С—і.

Выбарныя правы вайсковых.

З прычыны спадзяванага вострага канфлікту між Соймам і ўрадам у справе „падараванага" ваенным міністэрствам выключна п. п. афіцэрам і пад-афіцэрам права выбіраць у розныя дзяржаўныя ці камунальныя ўстановы,—цікаўна разглядзець, які-ж сэнс запраўды мае паўсюдная забарона чыннай арміі прымаць актыўнае ўчасьце ў выбарах?

Перадусім яўна нязгодна з прынцыпам роўнасьці грамадзян у дэмакратыі — даваць гэтае права афіцэрам, калі яго пазбаўлены такія-ж грамадзяне — жаўнеры... А ваеннае міністэрства якраз і зрабіла гэта на варшаўскіх выбарах.

Пасьля, калі прызнаць права ўсім вайсковым прымаць учасьце ў выбарах, дык трэба даць ім усім і магчымасьць зрэалізаваць гэтае права ў часе выбараў, інакш кажучы, трэба ў дзень выбараў пусьціць на выбары дамоў, у іх самаўрадавыя акругі, усіх выбаршчыкаў—вайсковых.

Але гэта—ня ўсё. Трэба дзеля роўнасьці выбарных правоў—даць і вайсковым права рабіць мітынгі, агітаваць і г. д. Але тут-жа трэба было-б зьняць з іх на час выбарнай кампаніі ўсялякае аружжа—пэўна-ж, у імя тэй-жа роўнасьці з безаружнымі грамадзянамі. Папросту кажучы, — на ўвесь час выбарнай кампаніі трэба-б распусьціць, ці прынамся—разброіць усю краёвую армію...

Далей, як слушна кажа „Роботнік", „права агітацыі азначае канец усялякай вайсковай дысцыпліны",—прынамся на час выбарнай кампаніі. А можна сабе прадставіць і зусім іншы „парадак галасаваньня" ў добра зьмілітарызаванай дзяржаве: „галасаваньне батальёнаў, ці цэлых палкоў — пад начальствам ды па загаду п. п. генералаў" — за „добрыя", „свае", сьпіскі ці асобы... Так пэўна ж і робіцца ў „фашызаваных" дзяржавах!

З гэтага ясна, насколькі цікаўным мае быць паседжаньне соймавых камісіяў, ці пленуму Сойму, дзе прадстаўнікі ўраду ці ваеннага міністэрства—у адказ на прапазіцыю Лібэрмана — будуць тлумачыць свой дазвол галасаваць на выбарах паном афіцэрам і пад-афіцэрам пры адначаснай забароне рабіць тое-ж—жаўнерам.

Хатняя вайна у Кітаі.

Падрыхтоўка рашучага наступленьня на Пэкін.

Кітайскія карэспандэнты венскіх газэт даносяць, што ген. Фэнг і Чанг Кай Шэк злучанымі сіламі рыхтуюцца да рашучага ўдару на Пэкін. Суседнія правінцыі Хонан і Кіанг-Су—ужо ў руках нацыянальных арміяў.

Ген. Гален, радавы ваенны дарадца пры Ханькоўскім урадзе, думае навет, што арміям гэтым удасцца адрэзаць Чанг-Тсо-Ліну адступленьне ў Манджурыю. Абодва крыльлі Куо-Мін-Тангу (нацыянальнай партыі)—левае і правае—паразумеліся ўва ўсіх справах тактычных і стратэгічных.

Сілы праціўнікаў—амаль роўныя: Чанг-Тсо-Лін мае „верных“ войскаў толькі 180.000, але яны азброэны лепш. Далічаюць да іх яшчэ 90.000 арміяў Чжан-Джун-Чанга і Сун-Чуан-Фанга, але гэтыя войскі загнаны ў Шантунг, здэмаралізаваны і, як байцы, ня маюць ніякай вартасьці. Нацыянальныя арміі маюць усяго 260.000, з іх Нанкінскіх і Ханькоўскіх войскаў 180.000, а ген. Фэнга—80.000.

Дэманстрацыі ў Кантоне.

23-га чэрвеня ў Кантоне адбыліся вялізарныя работніцкія дэманстрацыі. Вялікшы атрад францускіх матросаў з кананеркі „Аргус“ зышоў на зямлю і заняў пазыцыі ў францускай канцэсіі. На вуліцах, па якіх праходзілі дэманстранты, пільнавала парадку кітайская паліцыя, маючы пры сабе панцырныя аўтамабілі і пажарніцкія помпы. Дэманстранты памыкаліся прарваць паліцэйскі кардон, але паліцыя здолела намовіць іх, каб пакінулі гэную думку.

Былыя працаўнікі Марское Камунікацыйнае Лініі Хон-Конг — Кантон — Макао абвясьцілі байкот англійскае лініі, забараняючы кітайцам езьдзіць на англійск. параходах.

Камуністычны сялянскі рух у Кітаі.

ПАТ наказуе, што карэспандэнт англійскае часопісі „Таймс“ паведамляе з Пэкіну аб камуністычным сялянскім руху ў правінцыі Хонан. Рух гэты прадстаўляе паважную небясьпеку (пэўне-ж — для Чанг-Тсо-Ліна і чужаземных „апякуноў“)! Сялянская камуністычная арганізацыя называецца „Чырвоныя Пікі“. Сяляне з'арганізованы на новачасны спосаб. Іх налічаюць каля чверці мільёна. Выступленьне гэтае арганізацыі адчасьці й выклікала адступленьне арміі Чанг-Тсо-Ліна з Хонану. Сялянскі рух варожа адносіцца да чужынцаў. Магчыма, што пашырэньне яго пойдзе шляхам паўстаньня боксэраў у 1900 годзе.

Кітаец аб сялянскім руху ў Кітаі.

У аднэй з замежных часопісяў мы знаходзім гэткае характэрнае пісьмо кітайскага дзеяча Сій-Хоўэнь-Яо аб тым сялянскім руху, які так трывожыць замежных імпэрыялістаў і іншых наймітаў:

„Не прашло яшчэ і 6 ці месяцаў з таго часу, як Паўднёва-Кітайскія войскі вызвалілі правінцыю Хунань, як былі адсюль прагнаны імпэрыялістыя і іншыя найміты, але ўжо прабудзілася і пачала бурліць наша вёска. Сяляне прачынаюцца ад тысячагодняга фэадальнага ўціску і пачынаюць будаваць свае рэвалюцыйныя арганізацыі.

„Галоўнаю з такіх арганізацый зьяўляюцца паўсюды арганізаваныя ў вызваленых мясцовасьцях сялянскія саюзы.

„Апошнія сталі адзінаю подпораю сельска-гаспадарчых рабочых, безьзямельных і малазямельных сялян: сялян арандатараў.

„На ўсей правінцыі Ху-нань у сялянскіх саюзах згуртавалася два мільёны сямей, або 10 мільёнаў чалавек, гэта значыць палова ўсяго насельніцтва правінцыі.

„Сялянскія саюзы зьяўляюцца настолькі моцнай арганізацыяй, што пад іхнім непасрэдным кіраўніцтвам праходзіць усё вясковае жыцьцё.

„Нажаль, у сялянскія саюзы мала ўцягнута сярэдняе, нябуйнае сялянства. Толькі патроху яны ўцягваюцца ў рэвалюцыйны рух; затое багатыры ў першыя часы пыталіся амаль ня ўсе зрабіцца членамі сялянскага саюзу, але былі адкінуты. Іхняе імкненьне з нутра аўладаць сялянскім рухам не ўдалося і яны занялі адносна нас варожую пазіцыю. Але так карысьней. Лепш мець у іх адкрытага ворага, чымся ненадзейнага саюзьніка.

„Вялікую работу праводзяць сялянскія саюзы па рэканструкцыі міліцыі і мясцовых органаў улады.

„Раней міліцыя была выключна ў руках памешчыкаў, цяперашняя-ж народная міліцыя выпаўняе загады рэвалюцыйнага народу. Акрамя таго і ўсе члены сялянскіх саюзаў, якія не ўваходзяць у склад міліцыі, сябе ўзбраяюць доўгімі пікамі з жалезнымі жаканечнікамі; піка — старое і паважанае аружжа кітайскага селяніна; не дарма большасьць сялянскіх саюзаў маюць назву „пікі“,—„Чырвоныя пікі“,—„Чорныя пікі“ і г. д.

„Рэарганізацыя і абнаўленьне мясцовых органаў улады вызываецца тым, што ранейшыя чыноўнікі настроены цалком супроць рэвалюцыі. Новыя органы ўлады пакуль ня маюць адзінага ўзору і яшчэ не наладзілі сваю работу, але важна тое, што там сядзіць і працуе селянін.

„Рэвалюцыя захапіла самыя глыбіны кітайскага сялянства. Прабудзіўся 500 мільённы кітайскі народ і ўладна заявіў сваё жаданьне быць вольным“.

Пао-Цын, Кітай. (—) Сій Хоўэнь Яо.

Вялікая ды пышная ўрачыстасьць у Пэкіне.

У часе, калі арміі Чанг-Тсо-Ліна церпяць паражэньні ды ўцякаюць перад пераможнымі нацыянальнымі войскамі Палудня, калі Пэкіну хутка награжае лёс Нанкіну і Шанхаю, Чанг-Тсо-Лін з вялізарнай помпай ды бесканечнымі „кітайскімі цэрэмоніямі“ сьвяткаваў у Пэкіне сваё ўступленьне ў правы ды годнасьць „генараліссімуса“ ўсіх кітайскіх войск“. Газэты пішуць, што такіх пышных цэрэмоніяў ня было ад часу імпэратарскага Кітаю. Цікаўна, што сам „генараліссімус“ ды ўсяўладны дыктатар маланкай праехаў сярод вялізарных масаў саноўнікаў, войска ды „кахаючага“ народу—у бранявым самаходзе. з кулямётамі, ня гледзячы на тое, што ўсё мейсца цэрэмоніі было акружана асабістай яго гвардыяй—з гарматамі, стрэльбамі, ды кулямётамі. На ўрачыстасьці гэтай адбылася прысяга „дыктатара на вернасьць Кітайскай... Рэспубліцы“.

Хай пазабавіцца ў апошнія свае дні...

Замежная палітыка Нямеччыны.

Прамова Штрэзэмана ў нямецкім парляманьце.

У нямецкім Сойме былі прачытаны інтэрпэляцыі камуністычных паслоў да мініст. замежных спраў—у справе вонкавай палітыкі Нямеччыны. Інтэрпэлянты пытаюцца, ці нямецкі ўрад узяў на сябе ў Жэнэве якія забавязаньні ў сувязі з проці-радавым блёкам, твораным Англіяй.

Мін. Штрэзэман у сваім адказе даў агляд усей замежнай палітыкі Нямеччыны, а разам і адказаў п. Пуанкарэ на яго апошнюю прамову.

Міністар пачаў прамову з выражэньня ўдзячнасьці камуністам, якія далі яму магчымасьць скарыстаць з адказу на інтэрпэляцыю — у значна шырэйшай меры. На закід камуністаў Штрэзэман цытуе нумар газ. „Известия“, якая сцьвярджае, што ў Жэнэве не ўдалося ўцягнуць Нямеччыну ў проці-радавы блёк... (—а як-жа-ж высокія джэнтльмэны англійскага ўраду заяўлялі, быццам навет і не рабілі ніякае спробы гэтага?!). І самі „Известия“, кажа Штрэзэман, слушна сцьвярджаюць, што Нямеччына, дзякуючы гэтаму апору, ня толькі не пацярпела паражэньня ў Жэнэве, але наадварот — іменна дзеля таго яшчэ ўсілілася ды павялічыла сваю павагу ў вачох усяго сьвету і навет у вачох вялікіх дзяржаваў, якія... „зразумелі ды прызналі неабходнасьць для Нямеччыны такой яе палітыкі“.

Далей Штрэзэман сцьвярдзіў, што Нямеччына не заняла ніякай пазіцыі ў сувязі з англійска-радавым разрывам: яна толькі глыбака сумуе з прычыны яго, ды будзе старацца адбудаваць добрыя зносіны паміж Англія і Радамі. Палітыка Нямеччыны астанецца нязьменнай, вызначанай—з аднаго боку—Лёкарнам і ўчасьцем Лігі Народаў, з другога боку — Рапальскім Трактатам з Радамі. Штрэзэман яшчэ раз пацьвярдзіў, што аб учасьці Нямеччыны ў нейкай проці-радавай коаліцыі ня можа быць гутаркі для Нямеччыны. Нямеччына ніколі ня будзе ўмешывацца ў унутраныя справы ССРР, але, з свайго боку, не дазволіць нікому звонку бурыць і свой унутраны палітычны і іншы лад. Дзеля таго, працуючы лёяльна з урадам прыязнага ССРР, нямецкі ўрад будзе ў сябе весьці барацьбу з агітацыяй III Інтэрнацыяналу, якога ня трэба зьмешываць з радавым урадам. Але ў гэтай барацьбе няма нічога супольнага з нейкай коаліцыяй проці ССРР.

Пасьля агляду разгледжаных, вырашаных і адложаных справаў Клайпэды, Гданску і інш., міністар перайшоў да справы зьмяншэньня акупацыйных войск, якая абгаварылася за кулісамі Рады Лігі ў Жэнэве. У вельмі сільных словах Штрэзэман сумуе, што на апошнім спатканьні дыпляматаў у Жэнэве справа гэтая ня была вырашана. Справу зьмяншэньня акупацыі Францыя дзіўна і не лягічна лучыла з збурэньнем нямецкіх крэпасьцяў на ўсходзе. Але-ж зьмяншэньне акупацыі ня ёсьць нейкая нагарода Нямеччыне за яе „добрае паступаньне“. „Не, гэта — спаўненьне прырачэньня саюзьнікаў, урачыста дадзенага імі Нямеччыне за падпісаньне Лёкарнскага Трактату. „Неспаўненьне гэтага прырачэньня Францыяй — рэч небясьпечная“. Гэтую небясьпеку асабліва выклікае апошняя прамова п. Пуанкарэ. Прамова гэтая прынята ўсей нямецкай апініяй з вялікім абурэньнем. Гэтая прамова—вельмі характэрна для далейшага разьвіцьця француска нямецкіх адносінаў. Дзіўна, што францускі прэм'ер казаў аб нейкім „неспаўненьні Нямеччынай сваіх абавязкаў у справе разбраеньня“. „Відаць, дзякуючы свайму залішне высокаму становішчу, п. Старшыня міністраў ня ведае дакладна пастановы Рады Саюзных Паслоў, якая выразна сцьвярдзіла, што ўсе забавязаньні ў справе разбраеньня былі Нямеччынай споўнены“. З боку Нямеччыны няма ніякіх перашкод дзеля далейшага разьвіцьця добра-суседзкіх адносінаў з Францыяй. Але трэба тут зусім выразна паставіць пытаньне: якой палітыкі хоча трымацца надалей францускі прэм'ер—палітыкі Руры, ці палітыкі Лёкарна? Дык трэба, каб ён выбраў або адну, або другую, бо адразу абедзьвюх вясьці ня можна. Нямеччына гатова прыняць працягненую да яе руку Францыі, у духу далейшага збліжэньня. Але Нямеччына ня прыме працягненай да яе рукі, як рукі пераможцы да пераможанага. Дык сучасны нямецкі ўрад, які рашуча выракся ідэі рэваншу (адамшчэньня), ня менш становча пытаецца ў Францыі: ці дух вайны мае надалей вызначаць разьвіцьцё ўзаемных адносінаў між намі, ці — дух міру? Бо-ж ня толькі немцы, але і ўсе народы сьвету маюць права паставіць францускаму прэм'еру гэтае пытаньне, бо ўсе нясуць адказнасьць за тое, што тварыцца цяпер.

Дыскусія над прамовай Штрэзэмана.

Пасьля прамовы Штрэзэмана завялася вельмі гарачая дыскусія.

Прадстаўнік Цэнтру заявіў адабрэньне замежнай палітыкі ўраду.

Цікаўную прамову сказаў сацыял-дэмакрат Брэтшэйд, які закідаў ураду яго гаспадарчую палітыку, што здаволівае інтарэсы толькі буйных абшарнікаў. Востра крытыкаваў ён Лігу Народаў, якая даўно амаль не зьліквідавана, бо-ж замест яе, толькі пад яе шырмай, ідуць, як і перад вайной, тайныя нарады дыпляматаў вялікіх дзяржаў. Пратэставаў ён проці жаданьня нямецкай буржуазіі дабіцца каляніяльных мандатаў: каляровыя народы будзяцца, паўстаюць да вольнага незалежнага жыцьця, дык хай сабе іншыя імпэрыялістычныя дзяржавы маюць агідныя ды крывавыя клапоты з імі, а не Нямеччына.

Павадыры крайняй правіцы закідалі Штрэзэману „здраду стану“: ён, як масон, згаварыўся з францускім масонам Брыянам, каб прадаць Францыі Нямеччыну.

„Левая камуністка“ Рута Фішэр востра крытыкавала ўрад.

У канцы, галасаваньнем адкінена прапазіцыя сацыялістаў, каб Нямеччына ўхілялася ад учасьця ў „камісіі каляніяльных мандатаў“ у Лізе Народаў. Адкінена і прапазіцыя камуністаў аб недаверыі Штрэзэману.

Уражаньне ад прамовы Штрэзэмана ў Францыі.

Большасьць францускай прэсы, якая так захоплівалася „баявым“ тонам прамовы Пуанкарэ, пасьля добрага адказу на яе з боку Штрэзэмана адразу зьмяніла тон. Газэты кажуць, што прамова Штрэзэмана будзе мець вялікі водгук на ўсім сьвеце, дый — не на карысьць Францыі. Газэты радзяць францускаму ўраду распачаць перагаворы з Нямеччынай у справе зьмяншэньня акупацыйных войск. Але шмат з іх — востра палемізуюць з Штрэзэманам, падтрымліваючы правакацыйны тон прамовы Пуанкарэ.

Хто чытае нашу газэту і не прысылае надпіскі, той ня спрые разьвіцьцю роднай беларускай прэсы.

БРАТЫ! Прысылайце надпісную плату, а хто задоўжыўся, выраўняйце свой доўг.

Праект зьмены выбарнага закону.

Соймавая правіца, пры „ціхім падтрыманьні“ значнай часткі „лявіцы“, ня кажучы ўжо аб „цэнтры“ і ўрадавых групах, стараецца з усіх сілаў, каб рэшту дзён паміраючага Сойму выкарыстаць дзеля зьмены „забойчага для палякоў і для Польскай Дзяржавы“ выбарнага закону, паводле якога рабіліся выбары ў 1922 г.

Мы ня будзем цяпер варачацца да гэтага закону, які быў тады прыняты чыста польскім Устаноўчым Соймам, у складзе каторага, як ведама, апрача пары жыдоў, не ўваходзілі прадстаўнікі нацыянальных меншасьцяў. Напомнім толькі, што гэты закон аб выбарах у Парлямант быў апрацаваны ведамым спэцыялістам па выбарных махінацыях, праф. Бузэкам, паслом-пястоўцам, які няраз спаўняў „заказы“ аўстрыяцкага ўраду на выбарныя праекты, што мелі на мэце „ўшчымленьне інародцаў“... Праф. Бузэк, як сам кажа ў сваей кніжцы аб законе, „прадбачыў“, што праз калючыя дроты яго „Ордынацыі“ здолее прайсьці нікчэмная лічба меншасьцёвых паслоў. Напрыклад, з беларусаў, дык навет у найлепшым разе ня меў прайсьці ніводзін пасол. Але аўтар „выбарнае ордынацыі“ 1922 г. груба памыліўся, і вось цяпер тая ж „польская большасьць Сойму“ слушна лічыць стары выбраны закон „забойчым для Нацыянальнай Польскай Дзяржавы“... Дык за ўсялякую цану хочуць зьмяніць яго так, каб ураtаваць „Польскую Нацыянальную Дзяржаву“, ці захаваць панаваньне ў ёй палякоў і не дапусьціць да „засільля меншасьцяў“...

Як ні як, а перад намі — новая спроба „разьвязаньня меншасьцявай праблемы“ Польскай Дзяржавай.

Як ведама, 4 клюбы правіцы і цэнтру ўнясьлі ў Сойм аж 4 праекты. Старшыня канстытуцыйнай камісіі эндэцкі прафэсар Гломбіньскі зрабіў з іх адзін, у якім зьмясьціў усе выдуманыя Хіена-Пястам „скарпіёны“ для меншасьцяў. Але гэткі залішне ўжо цынічны праект не прайшоў навет праз падкамісію, у якой асталіся толькі прадстаўнікі „польскага Сойму“. — Бо-ж меншасьцяў п. Гломбіньскі, здаецца, навет і ня пробаваў запрашаць... У сувязі з гэтым агідным праектам з падкамісіі выйшлі навет некаторыя прадстаўнікі клюбаў лявіцы. Паміж іншым—пэпээсы... Прышлося Хіена Пясту, ратуючы справу зьмены Ордынацыі, апрацоўваць новы праект, менш цынічны, ды больш прыемны для польскай лявіцы... Новы праект было даручана апрацаваць павадыру клюбу „Работнікаў-Нацыяналістаў“ (Н.П.Р.) п. Попелю, як „лончніку“ між польскай правіцай і лявіцай... І вось цяпер, якраз з узнаўленьнем працы гэнай падкамісіі ў прэсе зьявіўся гэны „праект п. Попеля“, з якім трэба пазнаёміцца і нам. Праект называецца цікаўна—так: „Праект паразуменьня ў справе рэформы Ордынацыі Выбарчай“. Прынцыпы яго гэткія:

Агульная лічба паслоў мае быць зьменшана.

Праект зусім ясна кажа, што зьмяншэньне павінна адбыцца коштам нацыянальных меншасьцяў.—Бо-ж у гэтым — зьмест і сэнс усяе „рэформы“...

„За падставу аблічэньня колькасьці мандатаў (на паасобныя акругі) праект бярэ лічбы галасаваўшых фактычна ў 1922 г.“. Пры гэтым ясна гаворыцца, што ў цэнтральных ды заходніх акругах Польшчы трэба па магчымасьці не зьмяншаць лічбы мандатаў (паслоў). Дык ясна, што дзеля таго трэба падвойна зьменшыць лічбу паслоў у ўсходніх акругох!

І запраўды, праект у радзе ўкраінскіх (галіцыйскіх акругоў), дзе ў 1922 г. украінскае насяленьне наагул байкатавала выбары, прапануе замацаваць гэтыя лічбы „галасаваўшых“ дзеля аблічэньня паводле іх лічбаў мандатаў... Але новы праект робіць тут, раўнуючы да папярэдняга,—вялікую „ўступку“: п. Попель прапануе наагул павялічыць лічбы галасаваўшых—на 20 прац.

Што гэта значыць? Дзеля таго, што ў украінскіх (—усходня-галіцыйскіх) акругох галасавала наагул толькі каля 40 працэнтаў насяленьня, а 60 прац. украінцаў байкатавала выбары,—праект п. Попеля мае за гэта абрэзаць на 40 прац. прадстаўніцтва гэтага ўкраінскага краю, даўшы яго насяленьню толькі 60 працэнтаў належных яму пасольскіх месцаў у парляманьце, ці, груба кажучы, амаль што не напалову зьменшыць лічбу ўкраінскіх паслоў ад гэтага краю ў Сойме...

У Валыншчыне дый на нашых беларускіх абшарах усе аблічэньні лічбы мандатаў праект прапануе таксама весьці на падставе лічбы пададзеных у 1922 г. галасоў. Гэткім чынам, рэакцыйны праект, паміма ўсяго іншага, сьведама ігнаруе ўсе вынікі палітычна-грамадзкага ўзгадаваньня ды разьвіцьця насяленьня гэтых беларускіх і ўкраінскіх краёў за апошнія 5 гадоў! Гэтак, калі ў Валыншчыне, напрыклад, толькі каля 60 прац. маючых выбарныя правы галасавала ў 1922 г., дык і цяпер трэба даць Валыншчыне ня поўную лічбу належных ей паслоў (роўна з цэнтральнай ды заходняй Польшчай), але 60 прац., ці напрыклад, замест 10 толькі 6...

Аблічыўшы паводле такога „модусу“ лічбы паслоў у Польшчы, праект прапануе, каб Заходняя і Цэнтр. Польшча паслала ў новы Сойм усяго 280 паслоў, Усходняя Польшча (Украінскія і Беларускія абшары) — толькі 60 паслоў. Гэтыя лічбы паслоў маюць даць акругі. А да таго яшчэ — з „паньствовых сьпіскаў“ будуць далучаны 80 паслоў. Гэткім чынам, новы Сойм мае складацца з 420 паслоў,—на 22 менш, чым сучасны.

На сколькі крыўдзіць гэты праект беларусаў і ўкраінцаў, відаць з таго, што, калі-б аблічэньні вяліся на падставе поўнай роўнасьці, дык лічба паслоў з Усходніх акругоў павялічылася-б амаль ня ў 2—3 разы... Бо-ж ужо выбарны закон п. Бузэка значна абрэзаў выбарныя праў(?) „крэсава(?)“ насяленьня, зьменшыўшы значна лічбу паслоў з усходніх ваяводстваў.

Але на гэтым ня спыняюцца „дабрадзействы“ праекту для крэсавых меншасьцяў. Справа ў тым, што з гэтых 60 мандатаў, ахвяраваных беларускім і ўкраінскім абшарам, трэба-ж зьбясьпечыць адпаведную колькасьць месца для польскага насяленьня „Крэсаў“, якое інакш, бяз гэтай „гарантыі“, рызыкуе не атрымаць ніводнага мандату...

Дык вось другі аддзел Праекту і гавора аб „Забясьпечаньні польскіх мандатаў на Усходзе“... Дзеля гэтай мэты Праект уводзіць на Усходзе злучэньне папарна існуючых акругоў у рад вялікіх акругоў—па 8, 9, 10, навет—12 мандатаў, спадзяючыся, што ў вялікіх акругох лягчэй здабываць хоць па адным месцы паляком. Гэткім чынам акругі Навагрудзкі і Лідзкі злучаюцца ў адзін 9-мандатны округ. Але, каб лягчэй „кіраваць“ выбарамі, праект прапануе яшчэ перарабіць і граніцы існуючых акругоў — „у мэтах аблягчэньня... камунікацыі“...

Праўда, Праект дазваляе, хаця з нэкаторымі абмяжаваньнямі, рабіць так-званы „саюз сьпіскаў“, які ня быў дазволены існуючай Ордынацыяй. Гэта — адзіная навіна, якую можна прывітаць, як запраўды патрэбную і карысную для ўсіх. Саюз сьпіскаў мае мэту дапамагчы слабым групам зьбераючы галасы і дастаць лішні мандат на „суму астаткаў“, якія б інакш, паасобку, прапалі б задарма...

Праект, апроч таго, павялічывае, як відно з вышэйшага, лічбу мандатаў з „лісты паньствовай“ на 8: было іх 72, цяпер прапануецца 80.

Вось які Праект мае быць падставай для дыскусіі ў канстытуцыйнай камісіі і падкамісіі! Ратуюцца, як могуць, топячы меншасьці, а з імі і падставы дэмакратыі, дый наагул—прававыя падставы дзяржаўнага ладу Польшчы...

У фашыстаускай Літве.

Літоўскі „Мусолінчык“—аб палітыцы Літвы.

Літоўскі прэм'ер праф. Вальдэмарас, які ўдае „літоўскага Мусоліні“ ў гутарцы з журналістамі высьветліў кірунак літоўскай унутранай і замежнай палітыкі.

Урад маніцца ў хуткім часе правясьці новую Канстытуцыю, якая будзе аддана на галасаваньне ўсяго народу. Дзеля таго, што новая Канстытуцыя значна зьмяняе ўзаемныя адносіны дзяржаўных уладаў, даючы значную перавагу ўладзе выканаўчай, дык першым крокам ураду і мае быць гэты рэфэрэндум, аддача на народнае галасаваньне гэтай канстытуцыі. Што да выбараў у Сойм, дык пакуль-што ...ёсьць пільнейшыя справы: бо і ўсенароднае галасаваньне адбудзецца толькі ў восені, калі скончыцца праца ў полі!... Пасьля, паводле новай канстытуцыі, павінен быць выбраны—таксама ўсім народам, а ня Соймам, як цяпер, — новы прэзыдэнт... А тады ўжо будзе відаць, калі зрабіць выбары ў Сойм... Ці гэты рэфэрэндум мае адбыцца шляхам тайнага галасаваньня, ці адкрыта? На гэтае запытаньне прэм'ер скандальна адказаў: „На гэта не магу згары цяпер даць пэўнага адказу“.

Ну, ясна-ж, — літоўскія фашысты нічога так не баяцца, як тайнай падачы галасоў, якая пэўна-ж праваліць іх дыктатуру!

На запытаньне журналістаў, ці будзе скасаваны ваенны стан у Літве ды цэнзура, „дыктатар“ адказаў, што пакуль-што — не! „Праўда, цэнзура рэч наагул ненармальная, але наша прэса такая ...рэакцыйная, такая „вясковая“, што трэба сьпярша стварыць добры „прэсавы дэкрэт“, а пасьля толькі даць прэсе свабоду“... Калі-ж будзе апрацаваны гэты „дэкрэт“, яшчэ няведама...

Яшчэ больш цікаўныя адказы даў літоўскі прэм'ер аб замежнай палітыцы і „насьпахах“ Літвы ў Жэнэве. У справе канфлікту з Клайпэдай і Нямеччынай ён прызнаўся, што Літва змушана была ўступіць... На запытаньне, ці не падымаў ён у Радзе Лігі, як абяцаў, едучы ў Жэнэву, справу Вільні, прэм'ер адказаў, што — не. Падымаць у часе польска-радавага канфлікту справу Вільні, якая зьяўляецца важнай стратэгічнай базай у выпадку польска-радавай вайны, літоўскі ўрад лічыў не сваячасным: усе заходнія дзяржавы згары сталі-б на бок Польшчы... На пытаньне, ці польскі пагляд, што справа Віленшчыны аканчальна вырашана ды пахавана, агульна падтрымліваецца ў Эўропе, п. Вальдэмарс адказаў: „Зусім не. Пакуль Літва ня прызнае сама гэтага рашэньня, гэтая справа ня можа лічыцца скончанай. Дык жа і СССР не прызнае яе скончанай. Ніводзін юрыст у Эўропе ня можа прызнаць гэтую справу скончанай. Іншая справа, што яна ня можа быць цяпер развязана міжнародавым парадкам у сучасным укладзе сілаў у Эўропе“.

Ці на апошнім зьездзе дыпляматаў у Жэнэве ня было спробаў пагадзіць Літву з Польшчай? Не, Рада Лігі была занята (за кулісамі!) канфліктам Англіі з СССР, пасьля — справай польска-радавых адносінаў. Польска-літоўскі спор не зьвяртаў на сябе ўвагі дыпляматаў.

Заявы літоўскага прафэсара.

З гэтымі заявамі прэм'ера Вальдэмараса вельмі цікаўна паставіць побач заявы, зробленыя на страніцах манархістычнага „Слова“ ў Вільні праф. Гарбачэвскім, які прыехаў толькі-што з Коўна ў Вільню. Аб літоўска-польскіх адносінах ён оказаў:

„У адносінах да Польшчы непрымірымае становішча папярэдніх габінэтаў паступова падлягае перагляду. Можам заявіць, што — у мысьль некатарых пунктаў дэклярацыі Вальдэмараса—пануючая партыя Таўтінінкаў вельмі паважна разглядае праблему завязаньня эканамічных зносінаў з Польшчай. Аднак, з прычыны таго, што панаваўшыя раней партыі вытварылі непрымірыма варожую атмасфэру ў гэтым кірунку, будзе зразумелым, што цяперашні ўрад ня можа гэтага кроку зрабіць адразу. Трэба чакаць на спрыяючыя гэтаму варункі“.

„Пасрэдніцтва Англіі літоўскі ўрад не адкінуў. Ен заверыў Англію, што яе інтарэсы ні ў якім выпадку ня будуць парушаны. А ў сэкрэтнай гутарцы з англійскім паслом Вальдэмарас заявіў толькі, што зьдзейсьненьне гэтых англійскіх імкненьняў яшчэ пакуль-што ня можа адбыцца. Колькі мне ведама, англійскі пасол астаўся зусім здаволены вынікамі сэкрэтнае гутаркі“...

На пытаньне працаўніка „Слова“, як трэба адносіцца да заяваў Літвы, што яна будзе вясьці перагаворы з Польшчай толькі пасьля аддачы Літве — Вільні? — праф. Гарбачэвскі адказаў:

„Цяпер гэтае становішча, як і ўся заграічная палітыка папярэдніх урадаў, — не на часе. Я маю ўражаньне, што гэтага варунку сягоньня ў Коўні не паставяць“...

Як бачым, нашы дапушчэньні, што ковенскі фашыстаўскі пераварот, зроблены за англійскія грошы, мае на мэце польска-літоўскую згоду, а мо' і аб'яднаньне, — знаходзяць паважнае пацьверджаньне.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Нарада прэм. Пілсудскага з мін. Залескім

22/VI адбылася даўжэйшая нарада прэм. Пілсудскага з мін. Залескім—аб справах заграічнай палітыкі Польшчы, а паміж іншым, як піша „Роботнік“, аб справе польска-радавых адносінаў. Больш падробная нарада ў апошняй справе адложана. Быццам польскі ўрад ня зьбіраецца сьпяшацца з адказам на другую радавую ноту.

Справа пазыкі.

Пакуль польскія дэлегаты езьдзяць з Варшавы ў Парыж і назад, а газэты зьмяшчаюць паўурадавыя весткі аб тым, быццам справа пазыкі ўжо вырашана ды ўмова будзе падпісана „ў найбліжэйшыя дні“,—у паважнай лёнданскай часопісі, органе англійскіх банкіраў, зьявілася толькі-што заметка, што амэрыканская пазыка Польшчы мае быць адложана на восень, а ў найлепшым разе—на ліпень. З Варшавы пішуць, быццам тыя-ж весткі курсуюць даўно сярод варшаўскіх фінансавых колаў. Тутака ясна кажуць, што амэрыканскія банкіры, настрашаныя пагрозамі розных канфліктаў у Эўропе, хочуць вычакаць, пакуль усе гэтыя „хмары на эўрапэйскім небасхіле“ разыйдуцца. Пэўна прычыніліся да затрыманьня пазыкі і стрэлы Кавэрды да Войкова. Гэтую вестку пацьвердзіла і адна з францускіх часопісяў (карэсп. „Кур. Варш.“ з 24/VI).

23 га чэрвеня ізноў адбылася канфэрэнцыя ў справе пазыкі ў Бэльвэдэры — пасьля таго, як п. Млынарскі здаў справу мін. Чэховічу з сваей падарожы ў Парыж і перагавораў з паўнамоцнікамі банкіраў. Як левая так і правая прэса страшэнна абураюцца на ўрад—за абсалютную сэкрэтнасьць усіх гэтых перагавораў.

А час ідзе, гаспадарчыя недахопы краю ўсьцяж растуць, запасы цьвёрдай — чужой валюты ў Польскім Банку плавяцца ды выцякаюць. Расьце і небясьпека, што зьмягчэе, распусьціцца ды паплыве ізноў і польская валюта.

Правал эндэцыі ў Варшаўскім самаўрадзе.

23/VI адбыліся выбары прэзыдыуму Варшаўскай Мястовай Рады.

Сьпярша, як пісалі правыя газэты, йшлі перагаворы між правым польскім блёкам так зван. „КОПС“ (Каміт. Абароны Польскасьці Сталіцы) і пэпэсамі—аб паразуменьні. Пэпэсы старанна хавалі гэтыя перагаворы, пярэчучы, быццам яны вяліся. Урэшце—пад націскам быццам свайго Ц. К—пэпэсы сарвалі перагаворы. Тады выбары адбыліся ў паразуменьні пэпэсаў з сьпіскам пілсудчыкаў і жыдамі. У выніку выбараў старшынёй Рады выбраны пасол ППС Яворовскі; апрача таго выбраны аж 4 віцэ-старшыні, — першы ізноў пэпэсавец, другі эндэк, трэці „пілсудчык“ і чацьверты жыд.

„Францускі“ скандал на Жырардоўскіх мануфактурах.

Клюб ППС унёс у Сойм інтэрпэляцыю ў справе „рабунковай гаспадаркі францускіх спэкулянтаў“, якім урад прадаў знамянітую Жырардоўскую мануфактуру. Інтэрпэляцыя высьвятляе яўнае імкненьне францускіх фабрыкантаў да зьліквідаваньня польскай мануфактуры, каб яе вырабы замяніць цалком увозам францускіх. Жырардоўскія валадыры ўжо і цяпер увозілі ў Польшу францускія тканіны, ставячы толькі на іх кляймо „Жырардаў“, ды выкручываючыся гэткім чынам ад заплаты мытаў. Інтэрпэляцыя закідае „ўраду сільнай рукі ды шпаркага дзеяньня“ — поўную пасыўнасьць, бязьдзейнасьць ды страх перад магутнымі францускімі „нова багатырамі“, усялякія праступленьні якіх коштам польскага скарбу ўрад пакорна цярпеў. Урад ня можа навет пазывацца на няведаньне, кажуць інтэрпэлянты, бо „мы самі няраз зварачалі яго ўвагу на рабунковую гаспадарку францускіх спэкулянтаў у Жырардове“.

У вострай рэдакцыйнай стацьці ў „Роботніку“ пас. Пончэк закідае ўраду, а перадусім яго гаспадарчаму кіраўніку віцэ прэм. Бартлю,—„лёгкаважаньне важных дзяржаўных спраў і палахлівасьць перад расшалелымі (францускімі) спэкулянтамі“.

Заграніцай.

Закон проці работнікаў прыняты англійскім парлямантам.

24-га чэрвеня англійскі парлямант — большасьцю 334 проці 139 галасоў—прыняў у трэцім чытаньні закон аб значных абмяжаваньнях правоў работніцкіх арганізацыяў, а перадусім—права забастоўкі.

За проціработніцкі закон галасавалі ўсе кансэрватары і частка лібэралаў; проці—пасла Партыі Працы (сацыялісты) і рэшта лібэралаў.

Пасьля прыняцьця закону павадыр работнікаў пас. Сноўдэн прачытаў дэклярацыю работніцкай партыі, якая заяўляе, што будзе ўсімі даступнымі работнікам законнымі мерамі і спосабамі вясьці барацьбу проці крыўднага, рэакцыйнага закону, накінутага работніцкай клясе часовай перавагай буржуазіі. Як толькі работнікі дойдуць да ўлады, першым крокам іх міністэрства будзе скасаваньне закону.

Першыя рэзультаты правакацыі п. Пуанкарэ.

Прамова Пуанкарэ, ізноў завагніўшая француска-нямецкія адносіны, ужо дае рэзультаты. Як ведама, дагэтуль яшчэ ня ўзноўлены гандлёвы трактат між Францыяй і Нямеччынай, які скончыўся больш году назад. Гандлёвыя зносіны між абыдвума краямі йшлі ў парадку тымчасовага дагавору, які таксама скончыўся якраз 30-га чэрвеня. Трэба вясьці перагаворы аб прадаўжэньні „тымчасовасьці“, ці аб сталым трактаце, але тут якраз п. Пуанкарэ падлажыў сваю „міну“. Францускія газэты пішуць, што Нямеччына раптам зрабілася такой няўступлівай, што яе цяжкіх варункаў прыняць зусім немагчыма. Справа-ж у тым, што Францыя больш заінтэрэсавана ў Нямеччыне, чым Нямеччына ў Францыі. Дык вось, французы хутка пачуюць, што ім каштуюць „патрыятычныя“ фразы п. Пуанкарэ.

Францускі парлямант выдаў камуністычнага пасла.

Доўга, ня гледзячы на страшэнны націск міністраў, францускі парлямант рашуча адмаўляўся ад выдачы паслоў суду. Так, нядаўна парлямант галасаваў проці выдачы 5 камуністычных паслоў. Пасьля, як ні пахваляўся францускі міністар, што зараз-жа заарыштуе камуністычнага пасла Дорыо, як толькі той вернецца з францускага Інда-Кітаю, дзе быццам падбураў францускіх жаўнераў, каб не ваявалі проці паўстанцаў, адначасна—арганізуючы паўстаньні сярод мясцовага насяленьня. Але вось, ужо некалькі дзён, як гэты пас. Дорыо ў Парыжу робіць мітынгі, гавора прамовы, а ўрад не чапае яго. Толькі 23/VI на паседжаньні парляманту знайшлася большасьць за дамаганьне міністра справядлівасьці ведамага рэакцыянера Барту (пуанкароўца), каб выдаць суду камуніст. дэпутата Кашэна. У часе прамовы сацыялістычнага пасла проці выдачаў паслоў наагул, сам пас. Кашэн ускочыў на лаўку ды закрычаў, што ён сам хоча арыштаваньня, каб давесьці, што ўмее цярпець за свае перакананьні ды ідэі.

Характэрны выпадак у баўгарскім парляманьце.

У баўгарскім парляманьце кароль чытаў сваю „тронную прамову“. Калі кароль прачытаў, быццам—„выбары ў краі адбыліся ў атмасфэры поўнай свабоды“, адзін з сацыялістычных паслоў Сахараў ня вытрымаў ды на ўсю салю крыкнуў: „Няпраўда“... Пачаўся страшэнны скандал... каб яго спыніць, быў зроблены перарыў, пасьля якога толькі кароль здолеў дачытаць да канца сваю прамову. А запраўды-ж апошнія выбары ў Баўгарыі, як зрэшта наагул на Балканах, адбыліся ў атмасфэры асаблівага паліцэйскага тэрору.

„Крок“ 4-х дзяржаваў у Бэлградзе.

Англія, Францыя, Нямеччына і Італія падалі югаслаўскаму ўраду супольную ноту, якая просіць высьветліць справу югаслаўскай ноты да Альбаніі, выражэньнямі якой абражаны альбанскі ўрад. Нота заяўляе, што адначасна—пад націскам тых-жа дзяржаваў—будзе звольнены з вастрогу арыштаваны ўрадовец югаслаўскага пасольства Дзюрковіч. Гэткім чынам быццам альбанска-югаслаўскі канфлікт мае быць зьліквідаваны. Альбанскі ўрад заявіў аднак-жа, што сьпярша суд... засудзіць гэтага Дзюрковіча, а пасьля прэм'ер Ахмэт Зогу яго памілуе ды толькі тады выпусьціць на волю.

ХРОНІКА.

Мастацкая выстаўка. У актовай салі Віленскай Беларускай Гімназіі 22 чэрвеня адчынілася цікаўная выстаўка. Гэта—выстаўка вучнёўскіх прац мастацкіх працоўняў пры Віленскай і Радашкоўскай беларускіх гімназіях пад кіраўніцтвам і з учасьцем гр. Язэпа Драздовіча.

Выстаўка будзе трываць да 5 ліпня. Уваход—вольны і бясплатны. Аглядаць можна кожын дзень ад 12 да 7 гадз. вечара.

Сьпіс вучняў, скончыўшых Віленскую Беларускую Гімназію ў 1927 годзе. Падаем тутака сьпіс вучняў, якія скончылі сёлета поўны сямігадовы курс Віл. Белар. Гімназіі і дадаткавую восьмую клясу.

Сем клясаў скончылі: Будзька Арына, Вайцэховіч Зьдзіслаў, Грыц Зоя, Зімніцкая Каліса, Казлоўская Аўгеня, Мамчыц Ксеня, Скурка Мар'я, Хвораст Іван, Цытовіч Леванід, Чартовіч Казімір, Шутовіч Вайцех, Шчасны Пётра, Шышка Уладзімір, Салагуб Аляксей, Рышкевіч Зінаіда і Озік Роза.

Восьмую клясу скончылі: Асаевіч Софья, Грыгарук Іван, Ільляшэвіч Хведар, Кавэрда Арына, Муха Айша і Яцкевіч Мікалай.

За што сідзяць беларускія вучні? „Rzeczpospolita“ даведалася (гл. № 171), быццам заарыштаваныя ў Вільні беларускія школьнікі Ільляшэвіч і Багдановіч сідзяць за „страшэнны праступак“: яны быццам зрывалі на вуліцах нейкія выбарныя адозвы!..

Падаем гэту інфармацыю на адказнасьць польскае газэты, напамінаючы, што—як пісала віленская прэса — польскія буржуазныя агітатары зусім бяскарна займаліся гэтым-жа ў часе выбараў радных м. Вільні...

Цікаўна, сколькі часу будуць марынаваць у вастрозе беларускіх школьнікаў?

Польскі голас аб „працы“ Павлюкевіча. У сувязі з забойствам радавага пасла ў Варшаве Барысам Кавэрдай, гадунцом „полёнофіла“ Павлюкевіча, польская часопісь „Przegl. Wileński“ ў № 11 піша:

„Спраўца замаху на радавага пасла Войкова радзіўся ў Інтурках, у Віленшчыне, рос сярод беларусаў, хадзіў у беларускую гімназію, урэшце працаваў у беларускай газэце п. Павлюкевіча, а ў рэзультаце прамовіла ў ім пачуцьцё вялікарускага патрыёта!.. Дык калі нам загадваюць верыць у шчырасьць пабуджэньняў, [illegible] пхнулі Барыса Кавэрду да выяўленьня гэтак ягонага расейскага патрыятызму, — то мусім дайсьці да сумнага вываду, што беларуская акцыя пана Павлюкевіча, падтрымліваная, як ведама, польскімі ўрадовымі сфэрамі, творыць не беларусаў-полёнофілаў, а нацыянальна асьвядомленых расейцаў. Якую карысьць польскі ўрад бача ў духовым абмаскоўленьні беларускае люднасьці, — гэта ўжо, ведама-ж, астаецца загадкай“.

Ну, для нас дык ніякае загадкі тутака няма: для некаторых польскіх элемэнтаў добрыя ўсе спосабы, якія так ці інакш аслабляюць беларускую сьвядомасьць у масах, хаця-б цаной абмаскоўліваньня іх!

Цынізм павадыроў польскага манархізму. П. САТ у віленскім абшарніцка-манархічным „Слове“ хваліцца, як лоўка ён з таварышамі абдурыў віленскіх выбаршчыкаў на апошніх выбарах у віленскі самаўрад.

Паслухайце:

„Наша выбарная арганізацыя — гэта-ж была папросту атака („шаржа“). У працягу якіх-небудзь 2 тыдняў змабілізавалі мы ўсё, каб толькі ўплынуць на палітычныя пераканаьні шырокага выбаршчыка, — пусьцілі ў ход старыя касьцюмы (вопраткі...), кракаўскія „балёнікі“, плякаты і г. д.“...

„Слово“, якое пахвалялася тым, што яно выражае апінію вышэйшай інтэлігенцыі места і „вёскі“ (гэта значыць—абшарніцтва), цяпер прызнаецца, што здабыла свае 4 мандаты толькі абдурыўшы „старымі вопраткамі“ ды пустымі каляровымі „балёнікамі“ якраз шэрую, найбольш цёмную масу віленскага насяленьня, якую можна яшчэ зманіць гэткімі „ўплывамі“ на іх грамадзкае ды палітычнае сумленьне... Дый цяпер, маючы 4 мандаты „даверыя“ ад гэтых абдураных выбаршчыкаў, само-ж сьмяецца з іх дзяцінай дурноты...

Афіцыяльны курс грошы на 28 чэрвеня. Даляр—8 зл. 89 гр. Залаты рубель — 4 зл. 60 гр.

28./VI. на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,90. Зал. р. 4,70. Чырв. 3 дал. 90 цэн.

Зоркі.

Залатая зорка,
Што ты пацямнела?
Мусіць, злыя хмары
Шлях закрылі твой?

Дзе твае сястрыцы?
Хай-бы іх сабрала,
Каб ў тумане ночы
Выйшлі ўсе у бой!

Вартай каб пасталі,
Дружнай грамадою,
Бо ж варожы сілы
Проці вас ідуць!

Пяруны пагрозай
Неба аглушаюць,
Хочуць вас, нявінных,
Яны праглынуць!

Сьмела гляньце ў вочы
Страшнай небясьпецы!
Хай мячы—праменьні
Вольнасьцяй гараць!

Ня перша прыгода
Сёньня вас спаткала:
З цемраю — навалай
Трэ' вам ваяваць!

Як спрабуюць хмары
Вашу зорну сілу,—
Страх іх апануе,
Хутка уцякуць!

З злоснай бліскавіцай
Громам адгукнуцца
І Сьлязамі — помстай
Зямлю аблюць!

1/V. 27. С. Галыш.

„Нашы“ готэнтоты.

Орган кс. Станкевіча, „Беларуская Крыніца“, надрукаваў у № 26 цэлае „казаньне“ аб.... ня сьмейцеся, але далібот так! — аб маральнасьці!

Ня хочацца верыць, праўда? Ня хочацца верыць, бо ж гэная родная сястрыца, ці мо' навет павадырка „Сялянскае Нівы“ пабіла рэкорд у шырэньні маральнага бруду, ілжы, даносаў і лаянкі... А тым часам якраз у ёй чытаем гэткія словы:

„Усялякія брудныя гісторыі, асабістыя разрахункі, грубыя лаянкі — вось хлеб штодзенны нашай сучаснасьці. Маладое пакаленьне, не затручанае гэтай грызьнёй, глядзіць на ўсё гэта і з жахам пытае, што будзе далей? А ворагі нашы? Яны цешацца, яны паціраюць рукі ад радасьці, што турмы, дзякуючы іх працы, запаўняюцца Беларусамі, што на балонках беларускіх газэт расьце і красуе праклятае, пасеянае імі зельле ненавісьці і розных інтрыгаў“...

Думаеце: „Беларуская Крыніца“ каецца ў усіх гэтых сваіх уласных праступках проці свайго народу і проці прынцыпаў маралі? Ды не: пакуль гэта было манаполіяй „Бел. Крыніцы“ і падгалоску яе—„для праваслаўных“ — „Сялянскае Нівы“, датуль усё было добра. Добра было, калі паны Ярэмічы, Рагулі, Більдзюкевічы — пад павадырствам кс. Станкевіча—нейкім нячыстым спосабам захапілі ў свае рукі створаны сэнатарэм Уласавым „Інстытут Беларускае Гаспадаркі і Культуры“ ды перарабілі яго з культурнае ўстановы—ў сваю партыйную крамку. Добра было і згодна з „маральнасьцяй“ клерыкалаў, калі кс. Станкевіч, Ярэміч і Рагуля (апошні „ [illegible] ке бѣлорусс!“) залівалі агіднай,

імі-ж зласьліва прыдуманай ілжой і брудамі тварцоў беларускага адраджэнскага руху, а ўжо зусім добра і „этычна“ было тое, што хадэкі й ярэмічавы сельсаюзьнікі падчае выбараў у віленскі мястовы самаўрад, каб перашкаджаць створанаму нашымі работнікамі „Беларускаму Выбарнаму Камітэту“, сфабрыкавалі свой ашуканскі камітэт пад тымжа назовам, што й работніцкі, ды гэтак адцягівалі беларускія галасы на кандыдата... расейцаў! Але-ж калі нехта зачапіў інтарэсы гэнае „цёплае кумпаніі“,—ну, дык гэта і „бруд“ і „немаральнасьць“ і „проціграмадзкі паступак“ і ўсё падобнае.

Што-ж пабудзіла ксяндзоўскую газэту так раптоўна загукаць аб непрызнаванай ею маральнасьці? А ні болей ні меней, як выступленьне запраўднага тварца „Бел. Сялянскага Саюзу“ доктара Яна Станкевіча і групы маральна чыстых сельсаюзьнікаў проці сучасных самачынных павадыроў сельсаюзу—„тройкі“ Ярэміча, Рагулі і Більдзюкевіча. Мы перадрукавалі некаторыя часткі гэтага выступленьня з аднаднёўкі **„Народ“**, бо-ж апублікаваныя тамака матэрыялы аказаліся забойчымі для гэнае „тройкі“, якая — побач з органам кс. Станкевіча—вяла запраўды агідную работу, сьвядома стараючыся абаламуціць і здэмаралізаваць працоўныя масы нашага народу. І за тое, што група нашых ідэйных праціўнікаў, але — прызнаем гэта з прыемнасьцяй—асабіста чэсных людзей наважылася ачысьціць „сельсаюз“ ад прымазаўшыхся да яго трутняў, — за гэта ксяндзоўская „Крыніца“ вылівае памыі на галовы гэных людзей...

Паўтараем: сельсаюзьнікі—як адны, так і другія—нашы ідэйныя праціўнікі. Але мы ахвотна адзначаем кожнае чэснае выступленьне навет нашых найвялікшых ідэйных ворагаў. На-жаль, выступленьне „Крыніцы“ ў абароне маралі мы лічым праяўленьнем маралі чыста **людаедзкае — готэнтоцкае**. Бо, калі-б навет „Крыніца“ мела хоць крыху рацыі ў вінавачаньні групы **„Народу“** ў нейкіх ня ідэйных, а асабістых разрахунках, дык і тады гэны пратэст ксяндзоўскага органу, які сам усьцяж грашыць проці маралі, будзе роўназначны з этыкай таго готэнтота, які лічыў, што забіць і зьесьць чужую жонку — гэта рэч добрая, а калі нехта зробе тое самае з ягонай жонкай,—о, тады гэта — цяжкі грэх!....

Гожа адзначыць, што хадэкі і ярэмічаўцы ўсё выступленьне **„Народу“** прыпісваюць аднаму чалавеку — д-ру Я. Станкевічу, дый на яго кідаюць розныя брудныя закіды. Але-ж з зьместу **„Народу“** выяўляецца, што з д-рам Станкевічам ідуць разам найлепшыя сілы сельсаюзьнікаў—такія дзеячы, як грам. Зянюк, грам. Мурашка, грам. Шавялянка і інш. Сам-жа д-р Я. Станкевіч, як мы даведаліся, нешта з год назад быў некалькі месяцаў фактычным кіраўнікам „Сялянскае Нівы“ і кінуў гэную работу сваю тады, калі гэная газэта занялася выліваньнем агідных брудаў і хлусьні на найвыдатнейшых і найпаважнейшых павадыроў беларускага руху. Пісьма ў рэдакцыю, у якім д-р Станкевіч, выходзячы з „Сялянскае Нівы“, пратэставаў проці гэнага бруду,—„тройка“, ведама-ж, не надрукавала...

КАРЭСПАНДЭНЦЫ

Як адбываліся выбары ў раду гмінную ў Новым-Пагосьце.

(Браслаўскі пав.).

6-га чэрвеня дэлегаты, выбраныя ад вёсак Нова-Пагостаўскай воласьці, шлі на выбары гміннае Рады. Па дарозе розныя панкі намаўлялі іх ня ісьці на выбары, што, казалі, усёроўна выбары адбудуцца і бяз іх, дык ня варта дарма марнаваць часу. Такі прыклад быў у вёсцы Камароўшчыне, праз якую праходзілі дэлегаты Камароўскай грамады. Заступнік войта Рыкун адмовіў трох чалавек ня ісьці на выбары, бо ўжо будзе позна, як ён казаў, а сам дык як мага пёрся ў Новы-Пагаст на выбары, каб хаця пасьпець на сьпісак кандыдатаў. Але ня гледзячы на тое, што, дзякуючы адгаворам, ня ўсе дэлегаты зьявіліся з Казакоўскае грамады—хапіла кандыдатаў паставіць на лісту. Сьпіскі кандыдатаў у раду былі зложаны так, што Рыкун быў прамінены. Тады войт Канаплянскі думаў схітрыць і пры чытаньні сьпіску кандыдатаў замест Ратчэнкава прачытаў Рыкун. Ён, відаць, думаў, што дэлегаты ня зьвернуць увагі на пастаноўку ў сьпісак Рыкуна замест Ратчэнкава і Рыкун пройдзе. Але сталася не па ягонаму. Дэлегаты закрычалі: „Далоў Рыкуна“! Дык войт і замаўчаў. Ашуканства не ўдалося. Трэба адзначыць, што паны, абшарнікі ўсе да аднаго зьявіліся і пазаймалі крэслы ў выбарнай салі. Але нашы сяляне не такія ўжо дурныя, каб выбралі іх на сваю бяду, дарэмна паночкі пудраваліся і галілі бароды, каб лепш выглядаць. Выйграў ад гэтага аптэкар Кац, бо доктар Валянскі кіраўнік выбарамі праваліўся.

Бабскі язык.

Як нас ашукалі.

(Пастаўскі пав., в. Гулі, Жосьнянскае гміны).

Трэці год істнуе ў нас польская школа, вучыцелька ў якой з Вільні, нейкая Мар'я Наўроцка. Мусіць, не намыліўся Інспэктар, што даверыў ёй толькі два аддзелы ў нашай школе, бо трэцьці аддзел ходзіць ў Слабаду за чатыры кілямэтры.

Каб даведацца аб яе кваліфікацыі, досіць сказаць, што аднаму з суседзяў яна заказавала купіць сялетры: „Niech pan kupi ósmą część k lo“ і давай лічыць на пальцах: „Kilo to będzie sto gramów, pół-kilo — pięćdziesiąt, czwarta część — dwadzieścia pięć i ósma to będzie... dwanaście gramów“...

І калі ёй гэты чалавек мусіць першы раз у жыцьці сказаў, што адзін кіляграм мае тысячу грамаў, а ня сто, то аж за галаву хапілася, чаму гэтак многа. Пасьля гэтага кожнаму стала вядома, якую навуку дасталі нашы дзеці ў гэтай школе. Сёлета зложылі дэклярацыі на Беларускую школу. Гміна адмовілася заверыць, але Бог ведае якой дарогай папалі яны ажно да Міністра, як вярнуліся адтуль, дык дзякуй Богу, ня мы гміну, а гміна нас папрасіла, каб ішлі заверацьь. Гуга! досіць радасьці. Але пакуль сонца ўзыйдзе, раса вочы выесьць. Скора прыехаў польскі вучыцель Я. Берняк, рабіць нейкія „sprawdzenia“, але мы моцна стаялі за сваё і сказалі, што толькі таго жадаем, што напісана ў дэклярацыях. Мусіць, гэтае „sprawdzanie“ памагло, як кашаль хваробе, бо зараз прыехаў сам інспэктар. Загадаў сабрацца ўсім бацькам у школу і што-ж? горай як на страшным судзе, бо там, кажуць, будуць судзіць усіх разам, а нас па адным ды найперш баб, а яны стварэньне баязьлівае, як засыпаў пытаньнямі: дзе бралі дэклярацыі? хто пісаў?, хто нагаварываў да гэтага? Ай Божа! што адказаць на гэткія пытаньні? Пяць чалавек ужо сядзяць на Лукішках, хаця-б і за гэта каго не пасадзілі, і кожнага з бацькоў датуль пытаў, пакуль не згаджаліся на дзьвёхмоўную школу. Што-ж зробіш? бяда папалам. Толькі папрасілі, каб быў трэцьці аддзел, бо так надаела дзеткам бадзяцца па чужых вёсках і думалі, што на гэтым ужо й кончыцца. Аж дзе там, благому ніколі канца няма. 27.V вучыцелька разам з солтысам хадзіла па хатах, кажучы, што калі вы хочаце, каб у вашай школе быў 3-ці аддзел, і каб вашы дзеці не хадзілі ў Слабаду — трэба на гэтых „паперках“ падпісацца. Мы ўсе парасьпісываліся, але назаўтрае ж даведаліся, што мы цяжка памыліліся, бо, дзякуючы гэткаму абману, мы падпісалі дэклярацыі на польскую школу. На трэцьці дзень сабралася нас пяць чалавек, папрасілі грам. Антона Малевіча, каб памог нам схадзіць да вучылькі і, калі яна пакажа, каб прачытаў і вытлумачыў, на чым мы расьпісаліся. Калі мы, прыйшоўшы папрасілі яе аб гэтым, то яна зказала, што нас не ашукала і, што гэтыя паперы ужо здадзены на пошту, хаця мы добра ведалі, што яны былі ў яе, і што ёй так надаела школьная праца — хай-бы ляпей прапалі ўсе школы.

На гэта грам. Малевіч адказаў, што няпрыемна ад вучыцеля слухаць такія рэчы, што вучыцель павінен пашырыць у людзях асьвету, а не жадаць, каб прападалі школы і з гэтым разышліся. Але, мусіць, не спадабаліся нашай „pani“ гэтыя праўдзівыя сказаныя для яе словы, бо захацела памсьціцца. Зараз-жа заявіла ў паліцыю, што з кулакамі дамагаліся дэклярацыяў, хацелі навет забіць яе. Грамадзян Антона Малевіча і Ануфрэя Бэрняковіча паклікалі на пастарунак. Хаця на гэта няма дзіва, бо, калі сабака брэша, то гаспадар павінен выйсьці на панадворак і паглядзець, што там дзеецца, але ўсё-ж такі няпрыемна, напісалі пратаколы і пагражаюць Лукішкамі, а за што?...

Сумны.

Будучая польская інтэлігенцыя

(М. Вялейка).

Есьць у Вялейцы польская гімназія ім. Сенькевіча, у якой выхоўваюцца будучыя грамадзяне, будучыя інтэлігенты Рэчыпаспалітае, але трэба было-б зьвярнуць увагу дырэктару гэтай гімназіі Любіч-Маеўскаму на захоўваньне яго вучняў, якія, праходзячы каля Народнага Дому Т-ва Беларускае Школы і кнігарні, па-хуліганцку выкрыківаюць беларускія словы перакручваючы іх і сьмяючыся над усім беларускім. У гэтым „геройскім высокім учынку“ адзначаецца вучань Мальцаў і яго сябры, з якімі ён спацэруе.

Паночкі, навучыцеся шанаваць чужое, каб шанавалі ваша. На гэта дырэктару трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу, бо ён таксама лічыць сябе „też białorusinem“, ды і вучняў напэўна 80% ёсьць беларусаў, але шмат з іх, якія лічаць сябе чыстакроўнымі палякамі Віленскае губэрні.

Падслухач.

Што будзе далей?

(Горадзеншчына, в. Масаляны).

Колькі разоў у нас ні адбываліся выбары солтысаў, усё-ж ніяк ня можам прыйсьці з імі да ладу. Яшчэ, калі была чыннай Грамада, выбіралі ў солтысы грамадаўцаў, дык, ведама, пан стараста гэтых выбараў не зацьверджываў. У часе ліквідацыі Грамады на пасаду солтыса быў намі выбраны грам. Янка Дзяк, але і яго спаткаў той самы лёс. Пан войт, бачучы, што нічога з народам ня зробіш, сам пры дапамозе сваіх прыхільнікаў, вызначыў солтысам свайго падлізьніка, ад якога нашы сялянскія інтарэсы далёкі, як сонца ад зямлі. Цікава, як пан войт будзе рабіць выбары ў гмінную раду? Няўжо-ж і тут ён прыстасуе свае ўласныя законы? Пажывём, пабачым.

Глухі.

Культурна-асьветная праца у Вялейскім павеце.

Rozwiązuję zebranie.

5 чэрвеня ў вёсцы Більцэвічах Гурток Т-ва Бел. Школы наладзіў спэктакль. Гулялі Вялейскія артысты.

Атрымалі ад Старосты дазвол, замальдавалі ў паліцыю, адным словам зрабілі ўсе, што трэба было.

Гулялі: „Ня розумам сьцяміў а сэрцам“, і „Суд“.

Першы, другі і трэці акты прайшлі добра, а вось чацьверты дык прайшоў з раптоўным дадаткам. Зьявіліся новыя артысты, якія яшчэ больш спрыгожылі пастаноўку.

У палавіне чацьвертага акту, раптам адчыняюцца дзьверы перапоўненага току і ўсе прысутныя ў ім спужаліся ад неспадзяванага фортэля пшодоўніка: „Rozwiązuję zabranie“.

Бедны мусіць надта сьпяшаўся, бо дыхаў, як баран у сьпякоту.

Спужаліся прысутныя, ведама, не ад страху, а ад раптоўнасьці. Ачнуліся толькі тады, калі пшодоўнік другі раз крыкнуў: „Proszę rozchodzić się“.

— Чаму, што такое? пасыпаліся пытаньні!

— Мы маем дазвол ад старосты.

— Wszystko równo, rozwiązuje zebranie.

— Але-ж гэта не сабраньне, а спэктакль.

— Wszystko równo, rozwiązuję zebranie.

(Цікава—пшодоўнік а ня можа зразумець розьнізу між сабраньнем і спэктаклям. Гэта-ж ня просты паліцыянт)?

— Калі так, дык пакажыце забарону ад Старосты.

— Żadnej zaborony niema, ja za wszystko odpowiadam.

— А чаму вы забараняеце?

— W stodole z słomianym dachrem nie można przedsdawień urządzać.

— Але-ж гэта ня першы раз, у другіх вёсках таксама ладзіліся спэктаклі ў такох, у якіх стрэхі саламяныя.

— Rozwiązuję zebranie i więcej nic!

— Але ж, пане пшодоўнік, дайце хоць скончыць.

— Nie można, a co będzie, kiedy stodoła spalisię? Ją będą odpowiadał.

— Ня спаліцца, мы асьцярожненька.

— Pozwolę, ale zamiast lamp zeby byli latarki. Добра, прынясьлі і лятаркі. Перакінуліся яшчэ колькімі славамі, ён спакарнеў і спэкталь усё-ж такі скончыўся!

Трэба адзначыць, што ў заяве да Старасты было напісана, што спэктакль будзе ладзіцца ў таку. Дык нашто-ж гэта камэдыя. Аднэй рукой дазваляю — другой забараняю.

Забараняюць ладзіць спэктаклі ў такох, забараняюць у школах, забараняюць у народных дамах, дык гдзе-ж нам, беларусам, ладзіць спэктаклі? Мусіць трэба зелезці на Марс, бо ў сваей бацькаўшчыне нам мейсца няма.

Навет культурнай працы ня можна праводзіць, падстаўляюць, гдзе толькі можна, нагу.

Прысутны.

Першы блін, але ня комам.

Давялося мне папасьціся на вечарыну-спэктакль у в. Асіпавічах, які быў наладжаны драматычнай сэкцыяй Гуртка Т-ва Бел. Школы.

Адыграны былі дзьве пьесы: „Выбары Старшыні“, і „Суд“.

Шмат мне прыходзілася бачыць гульню запраўдных артыстаў і аматараў у цэнтры Расеі, на Каўказе і Сыбіры, але на бацькаўшчыне, у вёсцы, я першы раз на спэктаклі.

Ня каюся, што й пашоў. Усё, што я чуў аб беларусах і што вядома з літэратуры, тут пацьвярдзілася.

Досіць у нас здольнасьці ўва ўсіх кірунках. Дай нам свабоду разьвіцьця, дай нам адукацыю, і беларусы даганяць сваіх братоў славян-заходніх.

Пачаўся спэктакль. Артысты-аматары на сцэне па першаму разу, але хапае ім прыроднай здольнасьці. Гэта можа падцьвердзіць такі факт: калі ў аднаго артыста падчас гульні люстэрка не аказалася і ён пачаў шукаць па сваіх кішэнях, дык каб ня было непатрэбнай паўзы — ен пачаў гаварыць з партнёрам сваім не па пьесе і так гутарылі мінут 10, пакуль не знайшоўся і падаў замест люстэрка запісвую кніжку (ў пьесе Суд).

Толькі артысты-спец можа так знайсьціся і ня страціць галавы, калі падчас ігры ня хопіць якога небудзь рэквізыту, а гэта сьведчыць, што дай беларусу толькі повад ад абрыці, а на каня ён сам сядзе.

Наагул гульня артыстаў было добрая. Глядзельнікі перад спэктаклем крытычна былі настроены адносна да сваіх артыстаў, але, як пабачылі гульню—дык разышліся з задаваленьнем.

Прасілі ладзіць спэктаклі яшчэ, а не абмяжоўвацца аднэй пастаноўкай.

Есьць у іх так сама свой струнны аркестр, пад гукі якога адбыліся пасьля спэктаклю скокі і які іграў пад час антрактаў.

Вярнуўся я да дому з радасьцю ў сэрцы. Заглядае ўжо Сонца і ў наша ваконца.

Алесь.

Першы дзень Сёмухі. Пераход ад вясны да лета. Пагода павінна быць як найлепшая. Яе мы чакалі, бо ўсё ўжо было прыгатавана да спэктаклю, які павінен адбыцца сёньня 12/VI. Трэба-ж, пагода нам здрадзіла, як кажуць, на каго Бог, на таго і людзі. З самага ранку дождж ліець, як з лубу.

Думалі ўжо адлажыць спэктакль на другі раз, але а шостай гадзіне з усходу стала ясьнець, ясьнець і а сёмай гадзіне ад дажджу засталіся лужы й балота.

Пастанавілі гуляць.

Каля касы ўсё больш і больш людцаў і ўсё свае. Аж сэрца радуецца. Свае ня здрадзяць.

Пачалі гатавацца і артысты. Аркестр стаў весялей забаўляць прысутных грамадзян у салі.

А дзевятай гадзіне была ўжо поўная саля.

Першай гулялі: „Суд над Трохпалёўкай“, якая слухалася досьць уважна, як навіна. Саўсім добра было-б, каб некаторыя артысты лепш падучылі ролі.

Другой ішла: „Пашыліся ў дурні“. Надта вясёлая пьеса, а яшчэ спрыгожаная дадатковымі сьпевамі і скокамі.

На наступны раз будзе адыграна „Паўлінка“ і „Заручыны Паўлінкі“.

Алесь.

З Радавае Беларусі.

Пяцігадовы пэрспэктыўны пляи разьвіцьця народнае гаспадаркі.

Рада Народных Камісараў Радавае Беларусі заслухала даклад аб пяцігадовым пэрспэктыўным пляне разьвіцьця народнае гаспадаркі БСРР (з 1925 26 па 1930-31 г.).

У галіне сельскае гаспадаркі генэральнай лініяй зьяўляецца інтэнсыфікацыя яе, павялічэньне працаёмкасьці (бяручы пад увагу аграрную перанаселенасьць БСРР), прычым з працаёмкіх культур павінны разьвівацца, галоўным чынам, тыя галіны, якія дастаўляюць сырызну прамысловасьці. Мяркуецца за гэтыя 5 год павялічэньне: пасеўнае плошчы—на 14,4 прац., сенажаці—на 11 прац., жывёлы ў пераводзе на буйную рагатую жывёлу—на 14,1 прац., а ўсяе валавое прадукцыі сельскае гаспадаркі—на 33,4 прац. Павялічэньне пасеўнае плошчы пойдзе за лік памяншэньня няўдобных зямель (правядзеньне мэліарацыі і г. д.), за лік павялічэньня шматпольнага севазвароту, прычым плошча пад збожжавымі культурамі павялічыцца ўсяго на 4 прац., плошча пад бульбай і карняплодамі — на 46,6 і пад іншымі тэхнічнымі культурамі—на 35,9 прац. Такім чынам, узрастае ўдзельная вага працаёмкіх тэхнічных культур.

Таксама павялічваецца на 16,6 прац. валавая прадукцыя сельскае гаспадаркі наагул і на 42,5 прац. валавая прадукцыя тэхнічных культур.

Паколькі рост прадукцыі сельскае гаспадаркі перавышае рост спажываньня сельскага насяленьня, то павялічыцца на 69,3 прац. тая частка прадукцыі, якую сялянства выкідае на рынак (т.-зв. таварная).

Што датычыцца лясное гаспадаркі, то, у сувязі са значнымі вырубкамі мінулых гадоў, выхад драўніны не павялічыцца, але недахват апалу будзе пакрыты разьвіцьцём дабываньня торфу, якое мяркуецца павялічыць за гэтыя 5 год з 180 тысяч куб. мэтр. да 1 мільёна.

Пытаньні энэргетыкі (рухавое сілы) мяркуецца разьвязаць праз узмацненае будаўніцтва электрычных установак, прычым валавы выраб іх (уключаючы і Асінаўскую раённую электрастанцыю), мяркуецца павялічыць за гэтыя 5 год больш, як у 5 разоў і мае быць выдана на будаўніцтва электраўстановак за гэтыя 5 год каля 38 мільён. руб. Электрабудаўніцтва будзе шчыльна зьвязана з прамысловым будаўніцтвам.

Па прамысловаму будаўніцтву будзе даволі значны рост. Мяркуецца, што валавы выраб цэнзавае прамысловасьці БСРР да 1930-31 г. дасьць 110,6 мільён. даваенных рубл. (без лесазагатовак павяліченьне на 125 прац.). Будзе пабудаваны цэлы рад фабрык і заводаў тэкстыльных (у зьвязку з павялічэньнем выхаду лёну), алейных, хімічных, харчавых, кансэрвавых, папяровых, па апрацоўцы прадуктаў смалакурэньня, дрэваапрацоўваючых, скураных заводаў, сельска-гаспадарчых машын і г. д., прычым, як відаць, усе гэтыя прадпрыёмствы будуць грунтавацца на мясцовай сырызьне і таннай электраэнэргіі ад буйных электраўстановак.

Для выкананьня праграмы капітальнага будаўніцтва і разгортваньня прамысловасьці мяркуецца адпусьціць за гэтыя 5 год 57,2 мільён. руб.

У зьвязку з жыльлёвым крызісам, мяркуецца адпусьціць на жылішчнае будаўніцтва каля 64 мільён. руб., у тым ліку па грамадзкаму сэктару—44 мільён. руб.

Разгледжаны таксама пяцігадовыя пляны дарожнага будаўніцтва, пабудоўкі чыгунак, гужавых дарог дзяржаўнага і мясцовага значэньня і г. д.

Такім чынам, зараз ужо вызначаны больш-менш дакладна тыя шляхі, на якіх будзе разьвівацца народная гаспадарка БСРР.

Навуковая камандыроўка праф. Пічэты.

Рэктар БДУ праф. Пічэта 3-га чэрвеня выехаў у навуковую камандыроўку па маршруту Варшава—Бэрлін—Прага. У камандыроўцы праф. Пічэта прабудзе два месяцы.

Рэдактар-Выдавец: М. Гічан.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.